PolotskSU



**УДК 94(476)+712.3**

# ПАЛАЦА-ПАРКАВЫЯ КОМПЛЕКСЫ ЛЕПЕЛЬСКАГА ПАВЕТА Ў XVIII – ПАЧАТКУ XIX стст.

***Н.А. МІЗЯРСКА***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*У артыкуле разглядаюцца палацава-паркавыя комплексы Лепельскага павета, на прыкладзе шляхецкіх уладанняў ў Пышна, Бачэйкава, Камені, Павуллі, Ухвішчы, Арэхаўна, Іванску, Бешанковічах, Быкаўшчыне, Двор Нізгалаве, Пліна.*

***Ключавыя словы:*** *палацава-паркавыя комплексы, шляхецкія ўладанні, сядзібы.*

**Уводзіны.** Помнікі палацава-паркавых комплексаў з'яўляюцца вялікай і багатай часткай архітэктурнай спадчыны Беларусі і вылучаюцца своеасаблівымі адметнасцямі, дзякуючы зліянню вядучых мастацкіх стыляў барока і класіцызму з мясцовымі школамі дойлідства. У Лепельскім павеце асобныя маёнткі з'яўляліся своеасаблівымі асяродкамі культуры, дзе збіраліся высокапастаўленыя асобы, мастакі і пісьменнікі. Эканамічны стан гэтых фальваркаў быў на даволі высокім узроўні (маёнткі Бачэйкава, Іванск, Павулле, Бешанковічы).

Прыцягвае ўвагу і штодзённае жыццё шляхецкага саслоўя, якое актыўна ўдзельнічала ў грамадска-палітычным і культурным жыцці краіны: на працягу некалькіх стагоддзяў займала кіруючыя пасады ў дзяржаўным апараце і дыпламатычнай службе, садзейнічала развіццю навукі і культуры. З шляхецкага асяроддзя Лепельскага павета выйшла шмат знакамітых навукоўцаў і культурных дзеячаў: Адам Грабніцкі, прафесар-памолаг з маёнтка Цётча Лепельскага павета; з маёнтка Ражаншчына паходзіць вядомы археолаг, гісторык і этнограф А М. Семянтоўскі; маёнтак у Бешанковічах належыў графу К. Храптовічу-Буцянёву, члену Віцебскай архіўнай камісіі.

Палітыка савецкай улады, войны і ліхалецці садзейнічалі знішчэнню нацыянальнага багацця беларускіх зямель. З былых 330 маёнткаў Лепельскага павета большасць страчана, мноства палацаў і сядзібаў згарэла, а некаторыя будынкі прыйшлі ў заняпад ад нерацыянальнага выкарыстання ў савецкія часы.

**Асноўнная частка.** З другой паловы XVIII ст., у сувязі з буйным росквітам шляхецкага землеўладання, на беларускіх землях пашырылася будаўніцтва палацава-паркавых комплексаў, якія адлюстроўвалі заможнасць гаспадароў і ўзводзіліся ў невялікіх мястэчках з маляўнічай прыродай. Калі ў першай палове XVIII стагоддзя ў асноўным мадэрнізаваліся існуючыя палацы, то ў сярэдзіне стагоддзя палацы будаваліся не толькі ў гарадах, але і ў вёсках [10, с. 11-12].

Сядзібы паступова эвалюцыяніравалі ад старажытных умацаваных двароў да добра выстраеных рэнесансавых комплексаў, а далей – да мастацкіх ансамбляў барока [18, с. 10]. На Беларусі ў архітэктуры і мастацтве стыль барока быў вядучым на працягу XVIII ст. У палацава-сядзібным будаўніцтве быў распаўсюджаны тып будынку, арганізаваны вакол параднага двара, курданера. Палацы і сядзібы можна падзяліць на тры асноўныя групы: П-падобныя ў плане, падковавобразныя і з асобна стаячымі флігелямі [10, с. 20].

У архітэктуры барока вялікая ўвага надавалася афармленню галоўнага фасада, тыльны бок будынка быў больш простым і афармляўся лаканічнымі дэкаратыўнымі сродкамі. Часам цэнтральныя часткі будынка з боку паркавага фасада выконваліся ў аналогіі з галоўным фасадам [10, с. 36].

Першапачаткова шляхецкія сядзібы былі драўляныя. Альбрэхт Адам намаляваў 20 ліпеня 1812 г. аддзел італьянскай гвардыі на фоне маёнтка ў Пышна. Стары палац меў уяздную браму ў стылі барока, якая складалася з двух павільёнаў для варты. Павільёны мелі вялікія вокны і злучаліся паміж сабой брамай. Налева ад брамы стаяў стары сядзібны будынак, накрыты гонтавым дахам з двума комінамі. Калі быў узведзены Шчытамі новы палац, старая сядзіба і брама былі разбураны [28, с. 484-485].

Часта новыя палацы і сядзібы шляхта ўзводзіла ў сувязі з прыездам караля. Клімуць Л.Я. у кнізе "Сармацкая культура беларускай шляхты ў XVI – XVIII стагоддзях" піша: " Магнаты звычайна абстаўлялі прыезд караля вельмі пышна, але ў многім больш для праслаўлення сваёй высакароднай асобы, чым асобы не вельмі паважанага караля. Каб дасягнуць гэтага, яны не шкадавалі ніякіх грошай на буданіўцтва і дэкарацыю" [15, с. 59].

Так, у Бачэйкаве ў сувязі з прыездам караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага ў 1769 г. за одно лета быў узведзены новы палац па праекту італьянскага архітэктара чарговым уладальнікам Юзэфам Цеханавецкім. Бачэйкаўскі палац праіснаваў да Другой Сусветнай вайны [27, с. 213]. Эжэн Роз дэ Багарнэ напісаў у сваім дзённіку, што маёнтак Бачэйкава быў самы прыгожы сярод тых, якія ён бачыў падчас напалеонаўскіх паходаў [27, с. 481-482]. Бочныя флігелі, як правіла, будаваліся ў адным

PolotskSU



стылявым характары з палацам, ствараючы закончаныя архітэктурныя ансамблі. У Бачэйкаве флігелі, як і палац, былі аздоблены порцікамі [10, с. 106].

Маёнтак у Камені, апошнім уладальнікам якога быў маршалак шляхты Залескі, прадстаўляў сабой драўляны двор. Сядзібу з тасканскімі калонамі, якая стаяла на высокім падмурку, накрываў гонтавы дах з чатырма комінам. Направа былі размешчаны драўляныя гаспадарчыя пабудовы [28, с. 482-483]. Шляхецкія сядзібы, у якіх архітэктура, жывапіс, скульптура і садова-паркавае мастацтва адрозніваліся сваімі мастацкімі якасцямі, былі вядомы не толькі ў нас, але і за мяжой [18, с. 10].

У другой палове XVIII – пачатку XIX ст. усталявалася традыцыя ўзводзіць новыя сядзібы побач са старыжытнымі абарончымі цытадэлямі, археалагічнымі паселішчамі і гарадзішчамі, а курганы спецыяльна ўключаліся ў паркавае асяроддзе. Так, у першай палове XIX ст., Антоній Сялява на месцы старажытнага мураванага будынку абарончага тыпу пабудаваў новую вялікую сядзібу ў маёнтку Павулле Лепельскага павета [12, с. 565].

Згодна з даследваннем Кулагіна, А.М. “Архітэктурная спадчына Ушаччыны” вядома, што: “Павульскі палац быў пабудаваны ў стылі класіцызму, меў у плане выцягнуты прамавугольнік і быў аднапавярховым. Будынак стаяў на высокім падмурку, накрыты двухсхільным гонтавым дахам, меў балкон і прасторную тэрасу. Перад І Сусветнай вайной палац пашырылі: да яго правага крыла далучылі прыбудову, якая значна павялічыла будынак, але парушыла яго ясную і простую сіметрычна-восевую кампазіцыю. Палац меў 20 пакояў, сярод якіх вылучаліся: абшырны хол-вестыбюль, вялікая сталовая з узорыстай паркетнай падлогай, два вялікіх і адзін малы анфілядна размешчаныя салоны. Усе памяшканні мелі багатую і стыльную мэблю. На сценах віселі партрэты прадстаўнікоў роду, шэраг якіх прыпісваецца італьянскім мастакам. Кафляныя печы ў пакоях былі розных колераў, а будуар гаспадыні меў мармуровы камін” [12, с. 566].

Надзвычай прадстаўнічымі былі ў Беларусі эпохі класіцызму і  рамантызму, росквіт якіх прыйшоўся на першую палову XIX стагоддзя. Развіццю рамантызму садзейнічыла прыгажосць беларускай прыроды [18, с. 10]. Першыя пабудовы ў стылі класіцызму з’явіліся ў вялікіх гарадах і маёнтках рускіх дваран, якія атрымалі тут землі ад царскага ўрада. У праектаванні такіх будынкаў удзельнічалі вядомыя мясцовыя дойліды, якія часта спалучалі рысы класіцызму са стылем барока. Палацы гэтага стылю мелі разнастайную тыпалогію: ад невялікага палаца-сядзібы да гарадскога палацавага комплексу, які займаў важнае месца ў планіровачнай структуры горада. Тыпавымі для палацаў гэтага перыяду былі выцягнутыя плоскасна распрацаваныя фасады і пластычна багатыя порцікі. Стварэнне палацавых комплексаў таксама залежыла ад густаў уладальнікаў, якія арыентаваліся на мясцовую віленскую архітэктурную школу, варшаўскую ці расійскую [1, с. 23-27].

Сядзібы шляхцічаў Лепельскага павета былі пабудаваны ў асноўным у стылі класіцызму, як, напрыклад, сядзіба ў Ухвішчы (уладальніца Л. Л. Івашэўская), якую Габрусь, Т.В. у сваім даследванні “Страчаная спадчына” апісала: “Сядзіба, пабудаваная ў пачатку XIX ст., прадстаўляла сабой прамавугольны ў плане дом на высокім падмурку, накрыты вальмавым гонтавым дахам з парамі лучковых люкарн. Па баках галоўнага фасада памяшчаліся два мураваныя чатырохкалонныя порцікі з трохвугольнымі франтонамі, белізна якіх кантрасна вылучалася на фоне шэрай шалёўкі сцен. Белізной эфектыўна падкрэслівалася і ліштва прамавугольных вокнаў і дзвярэй, а таксама шырокі падваконны пояс. Уваход цераз правы порцік вёў у службовую палову дома, цераз левы – у жылыя парадныя памяшканні. На тыльным фасадзе выступала невялікая тэраса” [2, с. 224].

Сядзіба Забелаў у Арэхаўна (Бабыніцкая воласць) ў другой палове XVIII ст. была збудавана невядомым італьянскім архітэктарам у барочным стылі, але пазней набыла класічны выгляд. Галоўны фасад з двума чатырохкалоннымі дарычнымі порцікамі, на адным з вуглоў парушаў агульную сіметрычна-восевую кампазіцыю двух’ яруснай вежай [2, с. 174].

Палац у Іванску, які належыў Валадковічам, быў пабудаваны ў стыле класіцызму ў пачатку XIX ст. Ён меў план моцна выцягнутага прамавугольніка і стаяў на высокіх падвальных памяшканнях з квадратнымі вокнамі. На фасадзе будынка выдзяляліся два аднолькавыя порцікі, кожны з якіх складаўся з чатырох калон. Порцікі завяршаліся трохкутнымі франтонамі з невялікімі вакенцамі. Сціплыя сцены ўпрыгожвалі вялікія вокны, падзеленыя на восем квадратных частак. Палац быў пакрыты гладкім двухсхільным гонтавым дахам. У будынку было дванаццаць пакояў [27, с. 235-236].

Палац у Бешанковічах быў пабудаваны ў 1770-я гады ў стылі ранняга класіцызму на ўзор гарадскога асабняка, павернутага ад вуліцы ў парк. П-падобны ў плане будынак фарміруе цэнтральны двухпавярховы корпус, які высунуты наперад і фланкіраваны аднапавярховымі флігелямі. Галоўны вулічны фасад вырашаны плоскасна з цэнтральным двухступенчатым рызалітам, апрацаваным рустам на першым паверсе і завершаным трохвугольным франтонам. Над парадным уваходам балкон з ажурнай агароджай (чугунна ліццё першай паловы XIX ст.) у стылі ампір. Першапачаткова палац меў анфілядную парадную планіроўку, асноўныя памяшканні былі на другім паверсе. Памяшканні першага паверха выкарыстоўваліся пад жыллё, склепы – пад гаспадарчыя патрэбы [13, с. 32].

PolotskSU



У XVIII – XIX стст., асабліва цанілася творчая фантазія дойліда, яго здольнасць стварыць новыя варыянты яшчэ не выкарыстаных спалучэнняў арыгінальных кампазіцый, уменне знайсці новыя крыніцы дэкаратыўных матываў. У гэтым сэнсе паказальнай з'яўляецца сядзіба Грабніцкіх у Арэхаўне (Ушацкая воласць). Сядзібны дом пабудаваны ў канцы XVIII стагоддзя ў стылі класіцызму, але сучасны выгляд набыў у пачатку XX стагоддзя. Пры першапачатковым сіметрычным вырашэнні плана дома яго франтальны фасад набыў асіметрычную кампазіцыю: П-падобны ў плане аднапавярховы будынак пад вальмавым дахам у цэнтральнай частцы вырашаны двухпавярховым рызалітам, якому супрацьпастаўлены чатырохкалонны атынкаваны порцік бакавога ўваходу, (цэнтральны ўваход замураваны ў другой палове XIX ст.). На паркавым фасадзе рызаліту адпавядае паўкруглы эркер параднай авальнай залы, з арачных вокнаў якой былі бачны пейзажны парк і возера. З арсеналам дэкаратыўных форм класіцызму тут выкарыстаны рустоўка, сандрыкі, буйныя падкарнізныя дэнтэкулы, замкавы камень [14, с. 220].

Былая сядзіба Козел-Паклеўскіх у Быкаўшчыне, якая была пабудавана ў пачатку XIX ст. спалучае драўляную і цікавую мураваную архітэктуру. Памер сядзібы быў 33 х 25 х 12 аршын. Унутры сядзібы было 20 пакояў, 19 дзвярэй, 50 вакон [9, с. 229].

Менавіта ў XVIII ст. пачынае цаніцца не проста камфорт у сядзібе, а раскоша, якая непарыўна звязваецца з заможнасцю і багаццем. У палацах вылучаюцца пакоі, спецыяльна прызначаныя для прыёму гасцей, якія забяспечваюцца адпаведнай мэбляй, неабходнымі прыналежнасцямі, начыннем. У першай чвэрці XIX ст. пакоям надавалі назвы па колерах сцен і адпаведнай абіўцы мэблі. Разам з новымі ўяўленнямі аб камфорце, якія прыйшлі з Захаду, і са зменамі ў становішчы жанчыны, з'яўляюцца будуары і салоны. Будуар быў месцам, дзе жанчына адпачывала і прымала блізкіх сяброў [25, с. 54].

Палац Цеханавецкіх быў самым заможным і велічным у Лепельскім павеце. У будуары бачэйкаўскага палаца паркетная падлога лічылася самай прыгожай, параўнаць якую можна было толькі з паркетам каралеўскага палаца ў Варшаве. Для ўзору тут выкарыстоўваліся 36 розных парод дрэва. У падлозе быў тайнік [16]. Палац упрыгожвала мэбля XVIII і XIX ст., акварэлі і гравюры. У палацы таксама меліся пакоі з назвамі: “блакітны салон”, “чырвоны салон”, “кабінет Напалеона”, “каралеўскі пакой”. “Блакітны салон” лічыўся з усіх пакояў палаца найбольш шыкоўным і абсталяваным. “Чырвоны салон”, названы з адпаведнасцю колеру абівачнай тканіны, меў 3 вакны, шыкоўную мэблю ў стылі Людовіка XVI. “Каралеўскі пакой”, як засведчыў у сваёй “Хроніцы” Уладзіслаў Цеханавецкі, быў абстаўлены шыкоўнай мэбляй, тут меліся люстэркі ў пазалочаных рамах, стаяла крыштальная лямпа з бронзы. На сценах віселі ўсяго дзве карціны – “Мадона” італьянскага мастака і партрэт Пятра Вялікага. У “кабінеце Напалеона” была мэбля ў стылі Людовіка XVI. Сцены ўпрыгожвалі 3 партрэты: Паўліны Цеханавецкай з мужам Канстанцінам Тышкевічам і іх сынам. Дапаўнялі ўсё французскія гравюры і невялікае пазалочанае люстэрка [16].

У маёнтку Храптовіча-Буцянёва ў Бешанковічах у палацы існаваў пакой, дзе начаваў дзве ночы Напалеон. Пазней пакой быў ператвораны ў музей да 1917 года [7]. Свае ўражанні аб бешанковіцкім палацы пакінуў М.В. Анцаў у брашуры “Экскурсія Віцебскай вучонай архіўнай камісіі 14 мая 1911 г. у мястэчка Бешанковічы”: « Ад помніка экскурсанты накіраваліся ў палац графа Храптовіча-Буцянёва, які, паводле надпісу на мармуровай дошцы, у 1708 г., наведаў імператар Пётр I Вялікі., у 1812 г. – імператар Напалеон I, а ў 1821 г. – імператар Аляксандр I Благаславёны. Пакой, які служыў спальняй Напалеону, з ложкам і мэбляй збярогся ў недатыкальнасці да сучаснага часу» [26, с. 61- 64].

Кожны маёнтак займаў пэўную тэрыторыю і меў свае межы, якія былі зафіксаваныя і падрабязна апісаныя ў размежаваным акце. Межы маёнтка не маглі парушацца іншымі асобамі без дазволу гаспадароў [17, с. 46]. Уладальнікі сядзібаў і фальваркаў Лепельскага павета часта трымалі ў сябе варту пры двары. Варта складалася з узброеных мужчын. У бачэйкаўскім маёнтку варта апраналася ў аднолькавыя мудзіры [24, с. 21].

Палацы і сядзібы афармляліся расійскімі і замежнымі архітэктарамі, мастакамі, майстрамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якія пры будаўніцтве ўлічвалі таксама асаблівасці беларускай прыроды. Пры гэтым пануючыя на той час класічныя архітэктурныя стылі барока і класіцызм часткова дапаўняліся і абагачаліся мясцовымі кампазіцыйнымі і канструктыўнымі прыёмамі, у выніку чаго былі створаны арыгінальныя і высокамастацкія палаца-паркавыя комплексы [19, с. 161].

Сады і паркі ў шляхецкіх маёнтках у XVIII – пачатку XIX стст. былі месцам для чытання кніг, адасобленых разважанняў, паэтычных мараў. Для дасягнення гэтай мэты тут ставіліся альтанкі, лаўкі, фарміраваліся лабірынты. Паркі ва ўсе часы былі напоўнены гукамі: спевамі птушак, шумам вадапада ці фантана, шапаценнем лісця [23, с. 388-391]. Тут раслі розныя пароды дрэў, набольш распаўсюджанымі былі такія: веймутавая сосна, лістоўніца, піхта бальзамічная, белая акацыя, амерыканская ліпа, чарэшня, конскі каштан, грэцкі арэх, шаўкавіца і інш. Сярод кустоў у садах і парках раслі міндаль, барбарысы, карагана, ляшчына, баярышнік, бузіна чорная і інш. У парку меўся таксама разнастайны састаў травяністых раслін: палын, астра, ірыс, люпін і іншыя [23, с. 395-396]. Фантаны эпохі барока здзіўлялі ча-

PolotskSU



лавека сваёй прыгажосцю і веліччу. Некаторыя з іх маглі нават “спяваць”, дзякуючы спецыяльнаму музычнаму прыстасаванню [23, с. 394].

Пейзажны накірунак у паркабудаўніцтве ўзнік у Англіі і набыў папулярнасць на беларускіх землях у другой палове XVIII – пачатку XIX стст. Для пейзажнага парку была ўласціва свабодная планіроўка, дамінаванне натуральнай прыроды, якую падкрэслівалі дойліды штучнымі кампазіцыямі. Разнастайнасць пейзажаў дасягалася за кошт вялікіх, найбольш маляўнічых тэрыторый: на тэрасах рэк, берагах азёр, сярод лясных масіваў [22, с. 93]. У гэтых парках спецыяльна падаўжаліся дарожкі, каб прадоўжыць шпацыры, даць магчымасць больш убачыць і перажыць [23, с. 402].

У некаторых выпадках новая пейзажная планіроўка накладвалася на існуючую, у другіх – спалучалася, або часткова перакрывалася рэгулярнай кампазіцыяй. Прыкладам парка пераходнага перыяду ў Лепельскім павеце з’яўляўся парк у Двор Нізгалава, які набыў рысы пейзажнага пры апошнім уладальніку, адвакаце Мядзведскім у 1905 г. Парк меў 9 баскетаў, тэрасную сістэму з перападамі 1,5 – 3 метраў. Існаваў таксама і сад. Парк маёнтка Двор Нізгалава славіўся 39 відамі розных насаджэнняў. Тут раслі ліпы, таполі Пятроўскага, сібірскія кедравыя сосны, еўрапейскія лістоўніцы, плакучыя бярозы, кусты венгерскага бэзу, серабрысты клён Віера, татарскі клён, шэрая вольха, сізая ружа і інш. [22, с. 94-100].

Яшчэ адным паркам пераходнага тыпу з’яўляецца парк у Бешанковічах, фарміраванне якога пачалося з апошняй трэці XVIII ст., у перыяд пераходу ад рэгулярных паркаў да пейзажных. Вядомы даследчык флоры У.У. Адамаў назваў бешанковіцкі парк англа-французскім. Пры заезднай дарозе, якая вяла да палаца, стаяла брама, а непадалёку знаходзіўся домік садоўніка і вялікая аранжарэя. Некалі існаваў каля парка ў Бешанковічах газон, дзе рос экзэмпляр лоха вузкалістнага. Было і некалькі алей: ліпавая, таполевая, конскакаштанавая, бярозавая, клёна-ясеневая. Паўночная частка парка мела 2 тэрасы, аснову насаджэнняў якіх складалі дубы, што былі і ў іншых частках парка. З высокага берага, паўночней палаца, можна было захапляцца хараством ракі і жывапіснай панарамай. Сярод кветак вырошчваліся аксаміткі, прымулы, ружы. У бешанковіцкім маёнтку існаваў сад і вырошчваўся вінаград [22, с. 107-108].

Паркавыя кампазіцыі звычайна дапаўняліся вадаёмамі, для якіх выкарытоўвалася развітая сістэма гідратэхнічных збудаванняў. Большасць вадаёмаў стваралася шляхам запруд на невялікіх рэках і ручайках, якія рэгуляваліся згодна з патрабаваннямі барочных кампазіцый. Так былі штучна выпрамлены рукавы ракі Ула ў Бачэйкаве, якія арганічна ўвайшлі ў паркавае асяроддзе [3, с. 225-226].

У маёнтку Бешанковічы па словах краязнаўцы Леаненка С.П. існаваў “пруд закаханых”: “В парке находилось два пруда, один из них назвался « пруд влюблённых», потому что он в виде сердца. В самом пруду, по рассказам местных жителей, в 60-е года XX века, когда чистили пруд, нашли небольшую коробочку, запаянную свинцом. Сначала думали, что там какие-либо драгоценности, но когда открыли ее, то нашли полуистлевшее сердечко. Можно представить, что когда-то гуляла здесь в парке молодая пара, и молодой человек подарил своей девушке атласное сердечко со словами: «Вот моё сердце, можешь его утопить, что оно никому не досталось, кроме тебя!» [7].

Другі, акруглай формы пруд, по словах краязнаўцы, называўся “графскім”. Ён меў пасярэдзіне астравок з альтанкай, дзе можна было адпачываць і захапляцца прыродай [27]. У маёнтку Козел-Паклеўскіх у Быкаўшчыне было чатыры сажалкі, якія сілкаваліся грунтовымі водамі і былі заўсёды чыстымі [8, с. 29].

Згодна з даследваннем краязнаўцы Калека І.У вядома, што маёнтак Бабынічы ў пачатку XX ст. належыў А.У. Шырыну і размяшчаўся ў прыгожым маляўнічым месцы, але не меў блізка азёр. Гэта не падабалася жонцы пана, і па яе загаду было зроблена рукатворнае возера побач з сядзібай, якое стала называцца Копанкай [5].

Палац Валадковічаў у Іванску акружаў вялікі пейзажны парк з газонамі, клумбамі кветак, ліпавымі алеямі і аранжарэяй. Пасярод парка стаяла альтанка ў акружэнні соснаў, сцежкі былі пасыпаны бітай цэглай чырвонага колеру. Тут былі пасаджаны лістоўніцы, тутавыя дрэвы, вязы, дубы, ліпы і іншыя пароды дрэў. На ўскрайку парка, каля штучнай сажалкі, стаяла капліца [4, с. 37].

Мастацтва пезажнага паркабудаўніцтва дасягнула свайго росквіту ў эпоху рамантызму, у канцы XVIII – першай палове XIX ст. У параўнанні з рэгулярным паркам, які прадназначаўся ў асноўным для забаў, пейзажны служыў для самотных разважанняў, сэнтаментальных сузіранняў прыроды. Гэтаму садзейнічалі і ўсе элементы парка [22, с. 111].

У рамантычных парках атрымаў развіццё культ меланхоліі, дзякуючы больш цяністым месцам і дрэвам з цёмным лісцем. Рамантызм звярнуў увагу на прыгажосць асобна стаячага дрэва, асабліва старажытнага. Старыя дрэвы лячыліся, рабіліся падпоркі, аблягчаліся кроны, ім імкнуліся прадоўжыць жыццё [23, с. 402]. Перасечаны рэльеф мясцовасці дыктаваў стварэнне рэгулярных паркаў другога тыпу – італьянскага. У іх прадугледжвалася афармленне перападаў рэльефу прамалінейнымі тэрасамі, лесвічнымі каскадамі, пандусамі, гротамі [3, с. 225].

Бачэйкаўскі парк рэгулярнага стылю быў закладзены ў апошняй чвэрці XVIII ст. па апісанню В.П. Цеханавецкага [22, с. 52]. У канцы 70-х гадоў XIX ст. ў Бачэйкаве быў закладзены новы “стрыжаны

PolotskSU



французкі парк". Парк размяшчаўся на ўсходнім беразе р. Ула, быў афармлены трыма тэрасамі з перападамі да двух метраў і абмежаваны прадольным каналам, упадаўшым у раку [20, с. 166]. Некаторыя экзэмпляры ліпы сведчылі аб адным з лабірынтаў у першым баскеце парка. У другім баскеце ліпамі была аформлена манаграма ўладальнікаў Юзафа і Ганны Цеханавецкіх (JC і AC) з выявамі радаваго герба Дубрава [23, с. 400]. Газоны былі аздоблены падстрыжанай травой і кветкамі ў форме фамільнага герба [11, с. 105].

Неад'емнай часткай парку былі аранжарэі і парнікі, дзе вырошчваліся экзатычныя расліны, кветкі, гіганцкія і карлікавыя дрэвы [3, с. 226]. Першая аранжарэя вядома з 1641 г. у маёнтку Бачэйкава, якую пабудаванў упраўляючы Э. Канстакудзен. У маёнтку Бешанковічы таксама мелася аранжарэя [22, с. 106]. У эпоху барока цанілася не толькі батанічная разнастайнасць, папулярнымі былі расліны з дзівоснымі кветкамі, пладамі. Часам дрэвы, кусты так падстрыгаліся, што набывалі форму звяроў, птушак [23, с. 395-396].

У багатых маёнтках меліся і звярынцы з буйваламі, мядзведзямі, ланямі. Для рамантычнага парка важнымі былі формы, афарбоўка лісцяў, кветак, якія змяняліся на працягу сезона [23, с. 397]. У маёнтку Бачэйкава, побач з домам прыслугі, стаяла клетка з мядзведзем. Для таго, каб забаўляць паноў, жывёлу навучылі набіраць і насіць ваду ў вёдрах. Для гэтага падаваўся спецыяльны гукавы сігнал [21].

У парках меліся і памятныя дрэвы, пасаджаныя ў гонар якіх-небудзь гістарычных падзей, вядомых асобаў, якія наведалі парк, нараджэння дзяцей. Так, са слоў Леаненка С.П. вядома, што: "На картине художника Фабера Дюфора, который изобразил Бешенковичи времён 1812 года можно увидеть дуб Напалеона. Самого императора на картине не видно, но согласно легенде император отдыхал под этим дубом и наблюдал за переправой» [7]. У павульскім маёнтку, які прыналежыў Сялявам, рос ў парку магутны 500-гадовы дуб, акаймаваны кветкавымі клумбамі. Алея, абсажаная бярозамі, называлася «напалеонаўскай». Існавалі ў маёнтках нават дрэвы, якія нібыта праганялі хваробу. Расказвае дырэктар Вароніцкага дома культуры Колычава Л.М.: "Вон там растет старый дуб, которому уже 200 лет. Когда пану Лисовскому болела голова, он прикладывал её к дубу и боль уходила» [6].

Знакамітымі помнікамі ў маёнтках былі не толькі дрэвы, але значэнне мелі рэшткі былых пабудоў, камяні, капліцы, помнікі хатнім жывёлам [23, с. 405]. Вядома, што шляхціч Якаў Лісоўскі меў у сваім маёнтку Варонічы каштоўны камень Вітаўта [8, с. 56]. Важным элементам парка з'ўлялася пад'яздная алея, якая звычайна супадала з цэнтральнай пларіровачнай воссю цэлага сядзібнага комплекса [10, с. 51].

Павульская сядзіба мела прыгожае размяшчэнне ў натуральным ландшафце. Франтальным фасадам была звернута да маляўнічага возера, ад якога дом адмяжоўваў вялізны, акаймаваны «жывой» агароджай, газон, засаджаны часткова серабрыстымі елкамі і кустамі руж, кветкавымі клумбамі. Другі вялікі газон цягнуўся ад тыльнага боку дома, на ім рос гіганцкі 500-гадовы дуб, акаймаваны кветкавымі клумбамі. Высаджаная вязамі і язмінавымі кустамі алея вяла да размешчанага ніжэй става. Алея, абсаджаная старымі бярозамі, прazваная «напалеонаўскай», пераходзіла ў дзядзінец, які вёў да рэзідэнцыі. Насупраць порціка, на ўскрайку газона, стаяла стылёвая мураваная ўяздная брама [12, с. 566].

Існавалі і даволі простыя паркі ў шляхецкіх маёнтках Лепельскага павета. Напрыклад, у плінскім маёнтку Галавачовых існаваў кампазіцыйны парк у выглядзе прамавугольніка, аднашэрагова абсаджанага дрэвамі [22, с. 88].

Было папулярным таксама уключаць у паркавае асяроддзе фрагменты дзікай прыроды, якія не падсыпаліся і не агароджваліся. Акцэнтам жа дальніх перспектыў парка станавіліся ветракі, табуны коней, стады кароў на пасвішчы [23, с. 408].

**Заключэнне.** У XVIII ст. у Лепельскім павеце пашырылася будаўніцтва палацава-паркавых комлексаў, якія адпавядалі высокаму грамадскаму статусу іх уладальнікаў. Першапачаткова палацы былі драўляныя і мелі выгляд умацаваных двароў, якія пазней перабудоўваліся згодна з новымі запатрабаваннямі часу. Некаторыя будынкі ўзводзіліся побач з археалагічнымі помнікамі, курганамі, цытадэлямі, якія арганічна ўпісваліся ў палаца-паркавы ландшафт (Павульская сядзіба). Стыль барока на беларускіх землях у архітэктуры і мастацтве быў вядучым на працягу XVIII ст., а з сярэдзіны стагоддзя – ракако. Станаўленне ў архітэктуры стылю класіцызма на Беларусі прыходзіцца на 1770-90 гг., што супадае з далучэннем да Расійскай імперыі. Мясцовыя дойліды нярэдка спалучалі рысы класіцызму з рысамі барока. Палацы Лепельскага павета XVIII ст. у асноўным былі пабудаваны ў стылі класіцызму, напрыклад, як: у Ухвішчы, Іванску, Бешанковічах, Арэхаўна. Шляхецкія палацы мелі раскошныя пакоі, абстаўленыя дарагой мэбляй, дзе зазвычай прымалі высокапастаўленых асобаў (бачэйкаўскі палац). Палацава-паркавыя комплексы афармляліся расійскімі і замежнымі мастакамі, скульптарамі, архітэктарамі, дзякуючы чаму, у спалучэнні з асноўнымі архітэктурнымі стылямі XVIII – XIX стст., яны набылі свае непаўторныя і адметныя рысы.

Неад'емнай часткай усіх палацавых ансамбляў з'яўляліся сады і паркі, якія прадназначаліся для шпацыра, філасофскіх разважанняў, паэтычных мараў. Гэтаму садзейнічылі вадаёмы, штучныя азёры, пруды ("пруд закаханых", "графскі пруд" у Бешанковічах, рукатворнае возера ў Бабынічах). У парках

PolotskSU



меліся памятныя дрэвы, пасаджаныя або ўзвялічаны ў гонар знакамітых падзей або асобаў (“дуб Напалеона” у Бешанковічах, “напалеонаўская алея” у Павуллі). Паркі Лепельскага павета другой паловы XVIII – пачатку XIX стст. насілі рысы пейзажнага стылю, які заключаўся ў свабоднай планіроўцы і дамінаванні натуральнай прыроды (парк у Іванску). У некаторых парках новая пейзажная планіроўка накладалася на існуючую (парк у Двор Нізгалава і Бешанковічах). У сувязі з перасечаным рэльефам мясцовасці ствараліся і рэгулярныя паркі італьянскага тыпу, дзе перапады рэльефа афармляліся тэрасамі, каскадамі, пандусамі, гротамі (парк у Бачэйкава). У шляхецкіх садах і парках будаваліся аранжарэі і парнікі, дзе вырошчваліся экзатычныя кветкі, плады і расліны (Бачэйкава, Бешанковічы). Існавалі ў шляхецкіх маёнтках і даволі простыя паркі (парк Галавачовых у Пліна).

ЛІТАРАТУРА

1. Архітэктура Беларусі : энцык. давед. / Беларус. Энцык. ; рэдкал.: А.А. Воінаў [і інш]. – Мінск : БелЭн, 1993. – 620 с. : іл.
2. Габрусь, Т.В. Страчаная спадчына / Т.В. Габрусь, А.М. Кулагін, Ю.У. Чантурыя, М.А. Ткачоў // Мінск : Беларусь, 2003 г. – 351 с.: іл.
3. Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. / рэдкал.: С.В. Марцэляў (гал. рэд.) [і інш] ; рэд. тома: Л.М. Сахута. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – Т.2 : Другая палова XVI – XVIII ст. 384 с.: іл.
4. Грыбко, В.В. Іванск і ваколіцы: гісторыка-краязнаўчы нарыс / Віктар Грыбко. – Мінск : Медысонт, 2011. – 124 с.
5. Запісана Мізярска Н.А. у 2016 г. ад настаўніцы Калека Ірыны Уладзіміраўны, 1950 г.н. у в. Блізніца Полацкага р-на.
6. Запісана Мізярска Н.А. у 2016 г. ад Колычавай Лідзіі Міхайлаўны, 1951 г.н. у в. Блізніца Полацкага р-на.
7. Запісана Мізярска Н.А. у 2016 г. ад краязнаўцы Леаненка Станіслава Пятровіча, 1970 г.н. у г.п. Бешанковічы.
8. Карасёў, В.Р. Па гістарычным мясцінам Полацкай зямлі / В.Р. Карасёў. – Мінск : Пачатковая школа, 2011. – 72с.: іл.
9. Карасёў, В.Р. Спадчына. Козел-Паклеўскія і Быкаўшчына /В.Р. Карасёў// Полацкі музейны штогоднік:(зборнік навуковых артыкулаў за 2011 г.) / уклад. Т.А. Джумантаева, І.П. Воднева, С.В. Нікалаева. — Полацк : НПГКМЗ, 2012. — С. 226–230.
10. Кулагин, А.Н. Архитектура дворцово-усадебных ансамблей Белоруссии: Вторая половина XVIII – начало XIX в. – Минск : Наука и техника, 1981. – 134 с., ил.
11. Кулагин, А.Н. Архитектура и искусство рококо в Белоруссии (В контексте общеевроп. культуры) / под ред. Г.И. Барышева. – Минск : Наука и техника, 1989. – 240с.: ил.
12. Кулагін, А.М. Архітэктурная спадчына Ушаччыны / А.М. Кулагін // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Ушацкага раёна. – Мінск : БЕЛТА, 2003. – С. 559–567.
2. Кулагін А.М. З архітэктурнай спадчыны / А.М. Кулагін // Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Бешанков. р-на. / Беларус. Сав. Энцыкл. ; рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.] ; маст.: А.М. Хількевіч. – Мінск : БелСЭ, 1991. – С. 31–38.
3. Кулагін, А.М. Эклектыка. Архітэктура Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. / А.М. Кулагін. – Мінск : Ураджай, 2000. – 304 с. іл.
4. Клімуць, Л.Я. Сармацкая культура беларускай шляхты ў XVI – XVIII стагоддзях / Л. Я. Клімуць. – Мінск : Беларусь, 2013. – 127 с. :іл.
5. Мальдис, А. Три вагона ценностей, вывезенных в Москву [Электронный ресурс]/ А. Мальдис // СБ Беларусь сегодня. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/tri-vagona-tsennostey-vyvezennykh-v-moskvu.html. – Дата доступа: 11.02. 2017.
6. Мілючэнкаў, С.А. Магнацкія і шляхецкія маёнткі /С.А. Мілючэнкаў // Нарысы гісторыі культуры Беларусі : у 4 т. / А.І. Лакотка [ і інш.] ; навук. рэд.: А.І. Лакотка. – Мінск : Беларус. Навука, 2013. – Т. 1 : Культура сацыяльнай эліты XIV – пачатку XX ст. – С. 43–65.
7. Платонова, Р.М. Историческая усадьба Поклевских-Козелл / Р.М. Платонова, М.З. Соловьёва, М.А. Платонова // Вестник Полоцкого государственного университета. Сер. F, Строительство. Прикладные науки. – 2013. – № 8. – С. 10–14.
8. Платонова, Р.М. Усадьба А. А. Римского-Корсакова в Полоцком районе / Р.М. Платонова // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия F, Строительство. Прикладные науки. – 2012. – № 16. – С. 14–18.
9. Русецкий, А.В. Поозерье, Подвинье, Верхнее Поднепровье (в контексте восточно-славянских и западно-европейских культурных процессов) : моногр. / А.В. Русецкий, Ю.А. Русецкий. – Витебск : Изд-во УО «ВГУ им. П.М. Машерова», 2008. – 540 с. : ил.

PolotskSU



10. Туманова, Е. Как выглядит лучший парк Беларуси / Е. Туманова // Інтерфакс – запад. Информационное агенство [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.interfax.by/article/81185. – Дата доступа: 03.02.2017.
11. Федорук, А.Т. Садово-паркое искусство Белорусии / А.Т. Федарук. – Мінск : Ураджай, 1989. – 247 с. : ил.
12. Федарук, А.Т. Семантыка і сімволіка старажытных паркаў / А.Т. Федарук // Нарысы гісторыі культуры Беларусі : у 4 т. / А.І. Лакотка [ і інш.] ; навук. рэд.: А.І. Лакотка. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – Т. 1 : Культура сацыяльнай эліты XIV – пачатку XX ст. – С. 387–411.
13. Цехановецкий, В.П. Хроника одного поместья. Бочейково / В.П. Цехановецкий. – Витебск, 1905. – 42 с.
14. Шыдлоўскі, С.А. Культура прывілеяванага саслоўя Беларусі: 1795 – 1864 гг. / С.А. Шыдлоўскі. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 168 с.
15. Экскурсія ў Бешанковічы / Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Бешанков. р-на / Беларус. Сав. Энцыкл. ; рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.] ; маст.^ А.М. Хількевіч. – Мінск : БелСЭ, 1991. – С. 61–65.
16. Aftanazy, R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej / R. Aftanazy. – Wrocław, Ossolineum, 1991–97. – T.1. – S. 335.
17. Aftanazy, R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej / R. Aftanazy. — Wrocław, Ossolineum, 1993. – T.4. S. 551.

## PALACE AND PARK COMPLEXES LEPEL DISTRICT IN THE XVIII-EARLY XIX CENTURE

***N. MIZIARSKA***

*In the article the palace and park complex, Lepel district, on the example of gentry estates in Great, Bocheikovo, Pavullo, Uhvishchy, Orechovno, Ivansk, Beshenkovichi, Bykovschina, Garden Nizgolovo, Plina.*
***Keywords:*** *palace and park complexes, noble estates, manor.*

**УДК 72.05**

## ИСТОРИЯ ИЗУЧЕНИЯ АРХИТЕКТУРЫ КОЛОКОЛЕН ПРАВОСЛАВНЫХ ХРАМОВ БЕЛАРУСИ

***А.С. ЗИНОВЬЕВ***
***(Полоцкий государственный университет)***

*Рассматривается архитектура колоколен в исследованиях белорусских историков архитектуры. Поиск литературных источников, иконографического материала в определении «Белорусской звонницы» – архитектурного облика, объемно-пространственной композиции, архитектурного стиля, конструктивных особенностей, акустических свойств, соотношение яруса звона с набором колоколов.*

***Ключевые слова:*** *колокольня, звонница, ярус звона, храм, архитектура Беларуси, культовая архитектура.*

Храм состоит из разных составляющих частей одного целого. На изучение был взят доминирующий элемент храма – колокольня. Причиной данного выбора стало отсутствие специализированной литературы для проектирования, которая позволит, опираясь на предшествующий опыт, учитывать современные строительные возможности и создавать новые архитектурные шедевры. Ведь спроектированные на сегодня колокольни не всегда отвечает требованиям функциональности при её эксплуатации.

Для достижения такой цели необходим подробный анализ источников по архитектуре колоколен, которые возводились на территории Беларуси. Такая работа поможет в определении белорусского облика звонницы.

**Основная часть.** На Руси, с принятием византийского христианства в X в., пришли традиции деревянных бил и металлических клепал, которые используются и сейчас взамен колоколов. Последние же, завезены из Западной Европы.

Первые упоминание о колоколах на территории Беларуси известно с XI в. В 1067 г. по сообщению «Повести временных лет», «заратися Всеслав, сын Брячиславль Полочьске и зая Новъгород». А в Софийской первой летописи сообщаются подробности: «...зая Новъгород до Неревьскаго конца и пожже, пойма